**А. М. Воінава**
Філалагічны факультэт,
кафедра беларускай мовы

# КАМПЕТЭНТАСНЫ ПАДЫХОД ДА САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ “СТЫЛІСТЫКА І КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ”

Сучасны падыход да мэтаў вышэйшага навучання заключаецца ў фарміраванні творчай асобы спецыяліста, здольнага да самаразвіцця, самаадукацыі і інавацыйнай дзейнасці. У гэтай сувязі асаблівая ўвага надаецца арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, якая выступае

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адной з важнейшых умоў рэалізацыі стандарта вышэйшай адукацыі новага пакалення, праектуемага ў кампетэнтнасным фармаце.

Кампетэнтнасць – гэта якасць спецыяліста, якая заключаецца ў гатоўнасці да ажыццяўлення якой-небудзь дзейнасці ў канкрэтных прафесійных сітуацыях. Сучасны выпускнік ВНУ павінен быць кампетэнтным у навукова-даследчай, педагагічнай, арганізацыйна-кіраўнічай і культурна-асветніцкай відах дзейнасці.

Дзяржаўны адукацыйны стандарт патрабуе ад сучаснага студэнта быць кампетэнтным пры вырашэнні наступных прафесійных задач: ажыццяўленне педагагічнай і навукова-метадычнай работы ў галіне філалогіі; правядзенне тэарэтычных і прыкладных навуковых даследаванняў; валоданне навыкамі кіравання працоўнымі калектывамі і выкарыстанне гэтых навыкаў на практыцы; кіраванне вучэбна-пазнаваўчай, навукова-даследчай і іншымі відамі дзейнасці навучэнцаў; рэгуляванне адносін і ўзаемадзеянняў у педагагічным працэсе; выкарыстанне найбольш аптымальных формаў, метадаў і сродкаў навучання і выхавання; арганізацыя вучэбных і пазавучэбных заняткаў; арганізацыя самастойнай работы студэнтаў;

Навучанне студэнтаў у вну павінна садзейнічаць іх кампетэнтнасці, заснаванай на набытых ведах і сфарміраваных уменнях, цэласнасці засваення набытых ведаў, іх сувязі з будучай прафесійнай дзейнасцю. Курс "Стылістыка і культура беларускага маўлення" якраз і накіраваны на фарміраванне адзначаных сацыяльна-асобасных кампетэнцый выпускніка.

У свеце новых тэндэнцый навучання мэтай выкладання курса "Стылістыка і культура беларускага маўлення" з'яўляецца авалоданне студэнтамі нормамі вуснай і пісьмовай форм літаратурнай мовы (правіламі вымаўлення, націску, словаўтварэння, граматыкі і г. д.), асноўнымі камунікатыўнымі якасцямі сучаснай беларускай мовы, сістэмай функцыянальных стыляў.

Задачы выцякаюць з мэты і заключаюцца ў авалоданні сістэмай тэарэтычных і практычных ведаў пра маўленчую культуру, асноўныя камунікатыўныя якасці-паказчыкі добрага маўлення, а таксама функцыянальныя стылі і стылістычныя рэсурсы мовы; засваенні норм беларускай літаратурнай мовы – арфаэпічных, акцэнтных, лексічных, арфаграфічных, марфалагічных, сінтаксічных; уменні фарміраваць ацэнку моўных сродкаў і мэтазгоднага іх выкарыстання ў адпаведнасці са зместам, характарам і сітуацыяй выказвання.

Курс займае важнае месца ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста-філолага, таму што фарміраванне нацыянальна свядомага спецыяліста немагчыма без высокай культуры мыслення. Асновай добрага ведання мовы з'яўляецца авалоданне ўсімі яе нормамі, а таксама

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

уменне выкарыстоўваць разнастайныя сродкі ў адпаведнасці з мэтамі і зместам маўлення. Таму асноўная ўвага пры выкладанні курса павінна быць скіравана на правільнасць маўлення, якая прадугледжвае захоўванне носьбітамі мовы літаратурнай нормы, што забяспечвае адзінства моўных сродкаў і ўзаемаразуменне паміж гаворачымі. У кампетэнцыю курса ўваходзіць шмат актуальных лінгвасацыялагічных і лінгвапсіхалагічных праблем, такіх, як культура мовы і грамадства, сутнасць моўных норм, ступень распаўсюджання той ці іншай моўнай з'явы ў моўнай практыцы народа, шляхі ўздзеяння на моўную практыку, моўная палітыка і інш.

Усё гэта сведчыць аб вялікім пазнавальным і культурна-выхаваўчым значэнні курса "Стылістыка і культура беларускага маўлення" ў сістэме філалагічных дысцыплін. У выніку вывучэння курса "Стылістыка і культура беларускага маўлення" выпускнік павінен ведаць гісторыю развіцця і фарміравання нормаў і стыляў беларускай мовы; класіфікацыю камунікатыўных якасцей сучаснай беларускай мовы; агульныя і спецыяльныя сродкі выяўленчай выразнасці маўлення; спецыфіку мастацкага перакладу ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму. Да практычных уменняў неабходна аднесці ўменні выкарыстоўваць форму, змест і функцыю моўнай адзінкі, вызначаць тоеснасць яе з іншымі адзінкамі мовы; прымяняць веды аб будове маўленчай сітуацыі; правільна будаваць тэкст любога стылю і тыпу; валодаць сродкамі тэхнічнай выразнасці вуснага і пісьмовага маўлення.

Кампетэнтнасны падыход у першую чаргу накіраваны на практычную рэалізацыю ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў, развіццё іх творчых здольнасцей.

Аналіз тэорыі і практыкі вышэйшай адукацыі паказвае, што комплексна сфарміраваць у студэнтаў сучасныя кампетэнцыі толькі з дапамогай лекцыйна-семінарскіх форм заняткаў немагчыма, бо матэрыял у асноўным засвойваецца ў гатовым выглядзе. На ўменне прыгожа і пераканаўча гаварыць скіроўваецца ў школе нязначная ўвага, таму найбольш эфектыўна кампетэнцыі могуць развівацца ў студэнтаў на аснове іх самастойнай пошукавай, творчай дзейнасці, самастойна атрыманага вопыту. У гэтым плане самастойная работа студэнтаў з'яўляецца аптымальнай сістэмай арганізацыі навучальнага працэсу, адэкватнага кампетэнтнаснаму падыходу ў адукацыі.

Узмацненне значнасці самастойнай работы, павелічэнне яе аб'ёму ў структуры вучэбных планаў і праграм абумоўлена шэрагам навукова-педагагічных і арганізацыйна-метадычных патрабаванняў да мадэрнізацыі адукацыйнага працэсу. Па-першае, арганізацыя самастойнай работы студэнтаў спрыяе асобасна арыентаванай накіраванасці ў прафесійнай падрыхтоўцы выпускнікоў, развіццю ў іх здольнасці да

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

самаадукацыі. Па-другое, самастойная работа студэнтаў забяспечвае самаразвіццё неабходных здольнасцей будучага выпускніка да больш складаных відаў дзейнасці, спосабы і змест якіх не могуць перадавацца або засвойвацца па ўзорах.

Важнейшая асаблівасць самастойнай работы заключаецца не толькі ў тым, што студэнт працуе без непасрэднай дапамогі выкладчыка, але і ў тым, што рэалізацыя мэт і зместу самастойнай вучэбна-даследчай дзейнасці студэнта спрыяе ажыццяўленню як навучальных функцый, так і функцый асобаснага самаразвіцця, самакіравання і кантролю.

Эфектыўнымі сродкамі арганізацыі самастойнай работы выступаюць даследчыцкія формы навучання – падрыхтоўка і выкананне лабараторных работ, напісанне рэфератаў, курсавых і дыпломных работ. Так, у вывучэнне курса “Культура беларускай мовы і стылістыка” на філалагічным факультэце ўваходзіць напісанне лабараторных работ, якія патрабуюць ад студэнта ўмення прымяняць атрыманыя не толькі па дадзенаму курсу веды, але і ўмення выкарыстаць усе раней набытыя па лінгвістычных дысцыплінах. Прапанаваная работа “Правільнасць маўлення” патрабуе добрага ведання мовы, авалодання ўсімі яе нормамі, што вывучаецца ў такіх раздзелах мовазнаўства, як фанетыка, марфалогія, семасіялогія, акцэнталогія, сінтаксіс і г. д. Рознаўзроўневыя заданні зводзяцца ў адной рабоце і патрабуюць ад студэнта не толькі добрых ведаў, але і ўмення аналізаваць тэкст, выправіць памылкі, самастойна адшукаць дадатковую літаратуру па незразумелым заданням і г. д. Пасля напісання работы студэнт робіць вывад, што асноўная ўвага пры выкладанні курса ‘беларуская мова’ ў школе павінна быць скіравана на правільнасць маўлення, якая прадугледжвае захоўванне носьбітамі мовы нормы і забяспечвае адзінства моўных сродкаў і ўзаемаразуменне паміж гаворачымі.

Другая лабараторная работа па “Культуры беларускай мовы і стылістыцы” – “Функцыянальныя стылі беларускай мовы” – таксама патрабуе не толькі ўмення самастойна працаваць, але і прымянення даследчыцкіх навыкаў, метадаў рэдагавання тэкстаў розных стыляў. На аснове аналізу тэкстаў розных стыляў студэнт робіць вывады аб стылістычнай абумоўленасці выкарыстання моўных сродкаў асаблівасцямі кантэксту, засвойвае прыёмы і спосабы найбольш мэтазгоднага выкарыстання сродкаў мовы ў адпаведнасці са зместам тэксту, яго жанрам і прызначэннем, набывае навыкі свядомага іх выбару, вучыцца рэцэнзаваць тэкст.

Самастойны падбор і аналіз тэкстаў на занятках па стылістыцы дапаможа пазнаёміцца з моцнымі пазіцыямі тэксту, навучыць бачыць і выдзяляць іх у тэксце, авалодаць двума асноўнымі спосабамі вызначэння загалоўка: тэматычным і сэнсавым. Сэнсавы спосаб звязаны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

з разуменнем асноўнай думкі тэксту. Асноўная думка – тое галоўнае, самае важнае, што хацеў сказаць яго аўтар. Сэнсавыя пытанні: “Што хацеў сказаць нам аўтар?”, “Якую самую галоўную думку вы можаце вылучыць у тэксце?” і г. д. Студэнты вылучаюць паняцце “мікратэма”, выяўляюць сувязь мікратэмы (вузкай тэмы) з агульнай тэмай.

Самастойны аналіз тэксту замацоўвае тэарэтычныя веды стылістычных і рытарычных фігур, якія выступаюць як вобразна-выяўленчыя сродкі і спрыяюць эстэтычнаму ўспрыняццю тэксту. Асобныя тыпы фігур суадносяцца з парадыгматычным узроўнем мовы, калі яны звязаны з выбарам моўных адзінак або іх значэнняў, іншыя – адпавядаюць сінтагматычнаму ўзроўню, звязанаму з размяшчэннем моўных элементаў у фразе, кантэксце (анафара, эпіфара, паралелізм, градацыя, інверсія, эліпсіс, умаўчанне, рытарычнае пытанне, шматзлучнікавасць і бяззлучнікавасць). На нашу думку, уменне вызначаць рытарычныя і стылістычныя фігуры будзе спрыяць авалоданню студэнтамі выразнымі, экспрэсіўнымі сродкамі мовы, навучыць прыёмам і спосабам найбольш мэтазгоднага выкарыстання мовы ў адпаведнасці са зместам тэксту, яго жанрам і прызначэннем.

Набытыя самастойна веды дапамагаюць фарміраваць здольную да самаадукацыі асобу, асобу, якая кіруецца ўнутранай матывацыяй, самастойна ставіць перад сабой мэту і выбірае шляхі яе рэалізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Літаратура**

1 Ермаков, Д. Откуда и куда ведёт компетентностный подход? / Д. Ермаков // Народное образование. – М., № 7, 2008. – С. 181–186.

2 Жарский, И. М. Разработка образовательных стандартов нового поколения в Республике Беларусь / И. М. Жарский, В. И. Воскресенский // Вышэйшая школа. – Минск, № 1, 2007. – С. 65–68.

3 Макаров, А. В. Инвариантные и вариативные модели управляемой самостоятельной работы студентов / А. В. Макаров [и др.] // Вышэйшая школа. – Минск, № 1, 2007. – С. 57–60.